[2] См.: Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК. Минск, 1973. Т. 1. (1918—1927). С. 181.
[3] См.: Шычко А. Указ. соч. С. 7.
[4] См.: Гісторыя Беларускай ССР. Мінск, 1973. Т. 3. С. 295.
[5] См.: Власенко Н. Борьба Компартии Белоруссии за построение фундамента социализма. Минск, 1970. С. 120.
[6] См.: Сельская і лясная гаспадарка. 1927. № 3. С. 4.
[7] См.: Беларуская вёска. 1929. 10 лютага.
[8] См.: Плуг. 1927. № 11. С. 4.
[9] См.: Советское строительство. 1927. № 2. С. 22.
[10] Там же. 1928. № 3—4. С. 69.
[11] См.: Дзейнасьць ураду БССР за 1926/27 год. Мінск, 1928. С. 32.
[12] Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях... С. 70.

Я. П. ПАРХІМЧЫК

# ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА ПАДБОРАМ І ПАДРЫХТОЎКАЙ ПРАПАГАНДЫСТАЎ СІСТЭМЫ ЭКАНАМІЧНАЙ АДУКАЦЫІ Ў ПРАМЫСЛОВАСЦІ РЭСПУБЛІКІ (1971—1980)

Эфектыўнасць эканамічнай адукацыі ў многім залежыць ад прапагандыста. Як адзначаў У. І. Ленін, прапагандыст «...павінен быць... кіраўніком... у справе эканамічнага будаўніцтва»[1]. Патрабаванні да прапагандыстаў у дачыненні да сучасных умоў былі канкрэтызаваны ў рашэннях з'ездаў, пастановах ЦК КПСС «Аб рабоце па падбору і выхаванню ідэалагічных кадраў у партыйнай арганізацыі Беларусі» (1974), ЦК КПБ «Аб рабоце партыйных камітэтаў Гродзенскай вобласці з кадрамі прапагандыстаў, палітінфарматараў і агітатараў» (1973) і шэрагу іншых і прадугледжвалі высокую палітычную, агульнаадукацыйную і партыйную падрыхтоўку, бездакорную маральную рэпутацыю, арганізатарскія здольнасці, навыкі работы з людзьмі, практычнае валоданне асновамі навуковай прапаганды, псіхалогіі, аратарскага таленту. У праекце «Асноўных напрамкаў перабудовы сістэмы палітычнай і эканамічнай вучобы» падкрэсліваецца, што работа з прапагандысцкімі кадрамі з'яўляецца цэнтральным звяном партыйнага кіраўніцтва марксісцка-ленінскай адукацыяй [2].

Агульнае кіраўніцтва падборам і падрыхтоўкай прапагандысцкіх кадраў эканамічнага ўсенавуча ў разглядаемы перыяд ажыццяўлялі партыйныя арганізацыі. У 70-я гады новай арганізацыйнай формай кіраўніцтва сталі саветы па эканамічнай адукацыі. Яны ствараліся пры ЦК, абкомах, гаркомах, райкомах партыі, міністэрствах, ведамствах, у працоўных калектывах і займаліся пытаннямі, звязанымі з практычным ўдасканаленнем навучання, у тым ліку і дзейнасцю прапагандыстаў. Так, напрыклад, савет па эканамічнай адукацыі пры Магілёўскім абкоме ў 1973/74 навучальным годзе заслухаў пытанні аб падрыхтоўцы прапагандысцкіх кадраў на прадпрыемствах хімічнай прамысловасці, аб стане эканамічнай вучобы ў будтрэсце № 12, у школах камуністычнай працы [3].

У мерапрыемствах ЦК КПБ па выкананню пастановы ЦК КПСС ад 31 жніўня 1971 года «Аб паляпшэнні эканамічнай адукацыі», а таксама шэрагу пастаноў бюро ЦК КПБ быў вызначаны парадак падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі прапагандыстаў. Аддзел прапаганды і агітацыі арганізаваў работу з выкладчыкамі раённых школ партыйнага актыву. Абласныя камітэты партыі рыхтавалі кіраўнікоў раённых семінараў прапагандыстаў. Пры дамах палітычнай асветы абкомаў партыі працавалі завочныя школы, кароткатэрміновыя і пастаянна дзеючыя курсы прапагандыстаў, курсы перападрыхтоўкі. Вучоба рэзерву кіраўнікоў эканамічных школ і семінараў ажыццяўлялася пры універсітэтах марксізма-ленінізма, у Рэспубліканскім міжгаліновым інстытуце павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў, на факультэтах грамадскіх прафесій вышэйшых навучальных устаноў. Гарадскія і раённыя камітэты партыі рыхтавалі прапагандыстаў на пастаянна дзеючых семінарах, у двухгадзічных школах рэзерву. Міністэрствы і ведамствы сумесна з дамамі палітычнай асветы праводзілі летнія курсы па падрыхтоўцы рэзерву прапагандыстаў, галіновыя мэтавыя семінары кіраўнікоў эканамічнай адукацыі. Праўленні Рэспубліканскай і абласных арганізацый таварыства «Веды» працавалі з выкладчыкамі народных універсітэтаў тэхніка-эканамічных ведаў, лектарамі пастаянна дзеючых лекторыяў. Абласныя саветы прафсаюзаў арганізавалі сумесна з дамамі палітычнай асветы абкомаў партыі работу з выкладчы-

камі школ камуністычнай працы. Пры парткомах буйных прадпрыемстваў навучанне прапагандыстаў ажыццяўлялася на семінарах [4]. Павышэнню кваліфікацыі, пашырэнню навукова-тэарэтычнай і прафесійнай кампетэнтнасці прапагандыстаў садзейнічаў удзел у іх навучанні навуковых работнікаў, партыйных і гаспадарчых кіраўнікоў, вядучых спецыялістаў міністэрстваў, ведамстваў.

Цэнтрамі работы з прапагандыстамі зарэкамендавалі сябе многія дамы і кабінеты палітычнай асветы пры абкомах, гаркомах і райкомах партыі. Яны садзейнічалі вывучэнню і распаўсюджанню вопыту работы лепшых прапагандыстаў. У 1978/79 навучальным годзе навукова-метадычны савет Дома палітычнай асветы Брэста разам з кабінетамі палітычнай асветы гаркомаў і райкомаў правёў у некалькіх школах эксперымент па такіх праблемах методыкі: «Формы і метады ўцягнення слухачоў у актыўную вытворчую і грамадскую дзейнасць», «Шляхі актывізацыі слухачоў у працэсе лекцый». Кансультанты-метадысты дапамагалі прапагандыстам распрацоўваць асабістыя творчыя планы заняткаў з улікам абраных праблем [4]. Павышэнню метадычнага майстэрства, пашырэнню ведаў спрыялі навукова-тэарэтычныя канферэнцыі. Райкомы партыі Магілёўскай вобласці ў 1972/73 навучальным годзе правялі раённыя метадычныя канферэнцыі прапагандыстаў па тэме «Шляхі павышэння якасці і эфектыўнасці эканамічнай вучобы»[5]. У 1975/76 навучальным годзе ў Віцебскай вобласці на працягу года адбылося 276 адкрытых заняткаў, 103 канферэнцыі па тэмах «Прапагандыст — ідэйны настаўнік, выхавацель і арганізатар мас», «Роль палітычнай і эканамічнай адукацыі ў развіцці працоўнай і грамадска-палітычнай актыўнасці працоўных»[6].

У ходзе падрыхтоўкі да XXV з'езда КПСС разгарнуўся рух «Прапагандыст — пяцігодцы». Прапагандысты Кастрычніцкага раёна Віцебска, Полацка, Наваполацка т. Г. Хашчаў (Віцебскі завод заточных станкоў імя XXII з'езда КПСС), А. Барысаў (Віцебскі завод «Эвістар»), А. Пасюціна (Віцебская фабрыка «Чырвоны Кастрычнік»), Г. Цясленка (вытворчае аб'яднанне «Палімір»), В. Алешкін, А. Зазуля (Наваполацкі нафтаперапрацоўчы завод) і іншыя ў восень 1975 года выступілі з ініцыятывай «Пяцігодцы эфектыўнасці і якасці — працу і клопат прапагандыстаў». Яны ўнеслі ў асабістыя творчыя планы сумесна са слухачамі мерапрыемствы-абавязацельствы на дзесятую пяцігодку і сустрэчныя планы на год. Асабістыя творчыя планы былі сарыентаваны на правядзенне не толькі вучэбнай, але і арганізатарскай ідэйна-выхаваўчай, настаўніцкай работы з улікам асаблівасцей калектываў. Важнае месца ў іх адводзілася развіццю сацыялістычнага спаборніцтва. Бюро Віцебскага абкома партыі адобрыла ініцыятыву прапагандыстаў, а ўсе партыйныя камітэты вобласці падтрымалі яе [7].

У падрыхтоўцы новых прапагандысцкіх кадраў добра зарэкамендавалі сябе школы рэзерву агітацыйна-прапагандысцкіх кадраў, арганізаваныя па ініцыятыве ЦК КПБ пры Ленінскім (Мінск) і Мінскім (сельскім) райкомах партыі. Улічваючы іх станоўчы вопыт, Цэнтральны Камітэт паставіў задачу стварыць у кожным раёне такія школы. І ўжо ў 1973/74 навучальным годзе яны былі створаны пры райкомах партыі, парткомах МАЗа, МТЗ [8].

Павышаць метадычнае майстэрства маладым прапагандыстам дапамагалі і адкрытыя заняткі лепшых майстроў прапаганды, шэфства вопытных прапагандыстаў, членаў метадычных саветаў, кабінетаў палітасветы, апорныя школы. Значную дапамогу партыйным арганізацыям у распаўсюджванні перадавога вопыту прапагандыстаў сістэмы эканамічнай адукацыі аказваў перыядычны друк, сродкі масавай інфармацыі. Часопісы «Коммунист Белоруссии», «Промышленность Белоруссии» асвятлялі на сваіх старонках такія тэмы, як удасканаленне работы прапагандыстаў, асновы эканамічнай тэорыі і палітыкі партыі, пытанні арганізацыі эканамічнай адукацыі. Толькі ў газеце «Вячэрні Мінск» з кастрычніка 1972 па май 1973 года было апублікавана 65 матэрыялаў пад рубрыкай «Прапагандысту на заметку»[9]. З 1973 года на Беларускім тэлебачанні і радыё дзейнічала «Школа прапагандысцкага майстэрства». З лекцыямі на тэлебачанні аб навуковых асновах прапаганды выступалі многія вядомыя спецыялісты ў галіне тэорыі і методыкі ідэалагічнай работы. Беларускае радыё вяло спецыяльную перадачу «Радыёклуб прапагандыста». Навучальны год у радыёшколе «Эканамічныя веды — у масы» рэдакцыя завяршала «круглым сталом» на якім прапагандысты абмяркоўвалі найбольш актуальныя праблемы.

Партыйныя камітэты аналізавалі передавы прапагандысцкі вопыт на сходах актыву, пасяджэннях аддзелаў прапаганды і агітацыі, метадычных саветах і саветах па эканамічнай адукацыі. Яны прымянялі розныя формы кантролю за работай прапагандыстаў эканамічнага ўсенавуча.

Працоўныя рэспублікі імкнуліся выкарыстаць веды, набытыя ў сістэме эканамічнай адукацыі, у практычнай дзейнасці сваіх калектываў. Вялікая роля ў дасягненні працоўных поспехаў, актывізацыі слухачоў належыць прапагандыстам. Толькі ўдзельнічаючы ў руху «Прапагандыст — пяцігодцы эфектыўнасці і якасці», прапагандысты Гродзенскай вобласці ў 1979/80 навучальным годзе аказалі дзейсную дапамогу слухачам у распрацоўцы больш 90 тысяч сацыялістычных абавязацельстваў і асабістых творчых планаў, каля 50 тысяч асабістых рахункаў эканоміі і беражлівасці, 25 тысяч планаў павышэння вытворчасці працы [10].

У рабоце з прапагандыстамі сістэмы эканамічнай адукацыі ў 70-я гады выявіліся такія недахопы, як захапленне асобных прапагандыстаў асветніцтвам, ігнараванне пытанняў тэорыі, падмена аналіза эканамічнай дзейнасці працоўных калектываў павярхоўнай інфармацыяй аб ходзе выканання планаў; значны быў адсеў слухачоў-прапагандыстаў з універсітэтаў марксізма-ленінізма, усё яшчэ недастаткова выкарыстоўваліся актыўныя формы заняткаў, тэхнічныя сродкі навучання.

У цэлым жа ў рэспубліцы ў гэтыя гады ўдасканальваўся ўзровень тэарэтычнага і метадычнага майстэрства прапагандыстаў сістэмы эканамічнай адукацыі, паляпшаўся іх якасны склад. Па падліках аўтара, да 1980 года амаль 70 % прапагандыстаў сістэмы эканамічнай адукацыі ў прамысловасці рэспублікі былі камуністамі, 73 % мелі вышэйшую і незакончаную вышэйшую адукацыю, 83 % былі спецыялістамі народнай гаспадаркі [11]. Вопыт падбору і падрыхтоўкі прапагандыстаў правераны практыкай дзесяцігоддзя, паслужыў асновай да далейшага ўдасканалення гэтай работы.

На XXVII з'ездзе КПСС адзначалася, што неабходна пераглядзець характар і змест усіх форм навучання ў сістэме эканамічнай адукацыі так, каб кожны работнік «мог кваліфікавана, з веданнем справы падыходзіць да эканамічнай ацэнкі тэхнічных рашэнняў [12]. Важная роля ў перабудове эканамічнай адукацыі належыць прапагандысту. Уяўляецца неабходным, улічваючы вопыт сямідзесятых гадоў, пры перабудове эканамічнай адукацыі больш старанна адбіраць для прапагандысцкай дзейнасці людзей, маючых да гэтага схільнасці, і шырэй выкарыстоўваць універсітэты марксізма-ленінізма для падрыхтоўкі і спецыялізацыі прапагандыстаў, вучыць іх умела прымяняць актыўныя формы заняткаў: дыскусіі, абмен вопытам, дзелавыя гульні, канферэнцыі.

[1] Ленін У. І. Творы. Т. 31. С. 344.
[2] Правда. 1987. 15 апр.
[3] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, оп. 47, д. 633, л. 188.
[4] Там жа. Оп. 130, д. 51, л. 19.
[5] Там жа. Оп. 47, д. 625, л. 102, 105.
[6] Там жа. Д. 644, л. 69.
[7] Партархіў Віцебскага АК КПБ. Ф. 1, оп. 136, д. 12, л. 98, 100, 101.
[8] Партархіў Мінскага АК КПБ. Ф. 69, оп. 12, д. 15, л. 185.
[9] Там жа. Оп. 11, д. 6, л. 142.
[10] Партархіў Гродзенскага АК КПБ. Ф. 1, оп. 84, д. 84, л. 39.
[11] ПА ІГП пры ЦК КПБ. Ф. 4, оп. 133, д. 48, л. 44, 65, 66, 85, 86, 100, 101, 116, 117, 118, 144, 145, 146.
[12] Матэрыялы XXVII з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. Мінск, 1986. С. 306—307.

А. А. ГЕРАСІМОВІЧ

# З ВОПЫТУ РАБОТЫ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ БЕЛАРУСІ ПА МАБІЛІЗАЦЫІ РАБОЧАГА КЛАСА НА АЖЫЦЦЯЎЛЕННЕ ХІМІЗАЦЫІ СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ Ў 70-я ГАДЫ

Састаўной часткай дзейнасці КПСС, накіраванай на павышэнне ролі рабочага класа ў ажыццяўленні праграмы інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі, з'яўляецца актывізацыя намаганняў работнікаў хімічнай прамысловасці ва ўсеўзрастаючай пастаўцы вёсцы мінеральных угнаенняў і сродкаў абароны раслін. Вядома, што ні меліярацыя, ні нават самая высокая